


# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

## ВЫПУСКУ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ВЫДАННЯЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

## НА 2017 ГОД

Падпіска на выданні ажыццяўляецца на дагаворнай аснове.

## Заказ выданняў:

Заказ на выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адсылайце на e-mail: nbb-izdat@mail.ru; edit@nlb.by або на адрас:

*Выдавецкі аддзел,*
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі,*
*пр. Незалежнасці, 116,*
*220114, г. Мінск.*

Калі падпіску за бібліятэку аплачвае аддзел культуры выканкама, то дагавор павінен заключацца **паміж Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і аддзелам культуры выканкама.**

Па пытаннях аплаты выданняў звяртайцеся па тэл.: (+375 17) 293 25 76, 293 28 40.

## Набыць выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі магчыма:

Нацыянальная бібліятэка Беларусі
Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск
Тэл. (+375 17) 293 28 21
Факс (+375 17) 266 37 23

У кіёску Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (за наяўны разлік)
Тэл. (+375 17) 293 28 52

РУП «Акадэмічная кніга»
Пр. Незалежнасці, 72, 220012, г. Мінск
Тэл./факс: (+375 17) 292 00 52, 292 46 52, 292 50 43

# ЗМЕСТ

ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ 4

ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЫДАННІ 9

КАЛЯНДАРНЫ ПЛАН
выхаду ў свет інфармацыйных выданняў
Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 2017 г. 10

# Друкаваныя выданні

## 1. **Бібліятэчны веснік:** зборнік артыкулаў. Вып. 9

*Адказны за выпуск Пшыбытка М.Г.*




Чарговы выпуск навуковага зборніка прысвечаны пытанням фарміравання сучаснай бібліятэчна-інфармацыйнай прасторы, перспектывам развіцця бібліятэк.

Прызначаны спецыялістам у галіне бібліятэчнай справы і інфармацыйных тэхналогій, выкладчыкам, аспірантам і магістрантам, кіраўнікам органаў упраўлення культуры.

## 2. **Бібліятэчны свет:** часопіс*

*Галоўны рэдактар Кірухіна Л.Г.*




Часопіс, заснавальнікамі якога з’яўляюцца Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, выдаецца з мэтай навукова-практычнага і навукова-метадычнага забеспячэння бібліятэчнай справы, а таксама раскрыцця творчага і навуковага патэнцыялу спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы і інфармацыйных тэхналогій.

Прадстаўляе інтарэс для тых, хто вывучае бібліятэчную справу, гісторыю, краязнаўства і культуру Беларусі.

* Падпіска на часопіс праводзіцца па каталогу Белпошты «Газеты и журналы Республики Беларусь». Індэксы выдання – 74895 (інд.), 748952 (вед.).

## 3. **Вільня часоў Францыска Скарыны = Vilnius Pranciškaus Skorinos laikais = Vilnius in the time of Francysk Skaryna**

*Адказны за выпуск Гарбачова Л.В.*




Напярэдадні святкавання 500-гадовага юбілею беларускага кнігадрукавання прапануем чытачам наведаць непаўторную Вільню, горад, які знаходзіўся на скрыжаванні шляхоў, гістарычных падзеяў і лёсаў многіх народаў і розных рэлігій. Горад, дзе выйшлі першыя беларускія кнігі, надрукаваныя тут у пачатку XVI ст. Францыскам Скарынам, асветнікам са славутага Полацка.

Вільня часоў Францыска Скарыны паўстае ў шматлікіх выявах: ад старажытных гравюр, планаў і картаў, жывапісных і графічных твораў знакамітых і малавядомых мастакоў, асобных артэфактаў, якія характарызуюць эпоху, да сучасных фотаздымкаў, зробленых з любоўю да гістарычнай спадчыны Вільнюса – сталіцы Літоўскай Рэспублікі.

Ілюстрацыйная частка кнігі дапоўнена фрагментамі літаратурных твораў пра Вільню XVI ст. вядомых аўтараў XIX – пачатку XX ст. В. Дружчыца, В. Гайжуціса, Ю. Крашэўскага, Ф. Дабранскага. Тэксты прадстаўлены на мове арыгіналаў.

Выданне адрасавана шырокаму колу чытачоў.

## 4. **Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі.** Вып. 20

*Адказны за выпуск Кірэева Г.У.*




Чарговы выпуск навуковага зборніка будзе прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. У ім будуць адлюстраваны матэрыялы па праблемах вывучэння, захоўвання і выкарыстання дакументальнай спадчыны Беларусі, гісторыі рукапіснай і друкаванай кнігі, архіўных дакументаў, бібліятэчнай справы, бібліяграфазнаўства, культуралогіі, падрыхтаваных беларускімі і замежнымі даследчыкамі

кніжнай культуры. Зборнік артыкулаў з'яўляецца навуковым выданнем, якое рэцэнзуецца і ўключана ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па педагагічных, гістарычных навуках і культуралогіі. Матэрыялы зборніка ўводзяць у навуковы ўжытак унікальныя дакументальныя помнікі, новыя дакументы, факты і звесткі, звязаныя з гісторыяй кнігі і культуры Беларусі, і будуць карыснымі ўсім, хто цікавіцца нашай спадчынай.

## 5. **Материалы V Международного конгресса «500 лет белорусского книгопечатания»**

*Ответственный за выпуск Есис Н.С.*




Сборник содержит материалы Международного конгресса «500 лет белорусского книгопечатания», который проходил в Национальной библиотеке Беларуси. Публикуются доклады известных специалистов национальных и крупнейших библиотек, научно-исследовательских учреждений, представителей других организаций Беларуси и зарубежных стран, посвященные 500-летию белорусского книгопечатания, а также актуальным вопросам развития библиотечного дела.

Материалы публикуются в авторской редакции.

## 6. **Новыя кнігі: па старонках беларускага друку****

*Адказны за выпуск Градоўкіна І.У.*




Штомесячны ўніверсальны бібліяграфічны бюлетэнь інфармуе пра новыя кнігі беларускіх выдавецтваў, найбольш значныя артыкулы з рэспубліканскай перыёдыкі, а таксама рэцэнзіі на беларускія выданні.

У якасці дадаткаў друкуюцца біяграфічныя спісы або агляды, прысвечаныя значным гістарычным падзеям і актуальным пытанням сучаснага развіцця Беларусі, "Беларускі каляндар, … год", а таксама матэрыялы да юбілеяў выдатных

дзеячаў краіны, шэрагу арганізацый і ўстаноў, што складаюць аснову эканомікі, культуры, навукі і асветы Беларусі.

Прызначаны ў дапамогу прафесійнай дзейнасці работнікаў бібліятэк, іншых культурных і асветных устаноў, а таксама студэнтам, навучэнцам і ўсім неабыякавым да гісторыі, культуры і сучаснага жыцця сваёй краіны, тым, хто адчувае неабходнасць аператыўна атрымліваць патрэбную інфармацыю для павышэння агульнай і прафесійнай адукацыі, самаадукацыі і арганізацыі вольнага часу.

*Тэмы дадаткаў на 2017 г.:*

№ 1. Даты беларускага календара (сакавік – красавік 2017 г.; 8 дат).

№ 2. Даты беларускага календара (май – чэрвень 2017 г.; 8 дат).

№ 3. Бабруйск — культурная сталіца 2017 г. і Гарады – юбіляры 2017 (Мінск і Орша – 950; Рагачоў – 875; Клічаў – 425 гадоў)

№ 4. З гісторыі беларускага кнігадрукавання (1517 г. – XVIII ст.).

№ 5. Даты беларускага календара (ліпень – верасень 2017 г.; 14 дат).

№ 6. Даты беларускага календара (кастрычнік – лістапад 2017 г.; 8 дат).

№ 7. (тэма дадатака ўдакладняецца, невядома годам чаго будзе аб'яўлены 2017 год).

№ 8. Беларускі каляндар, 2018 год. Частка 1.

№ 9. Беларускі каляндар, 2018 год. Частка 2.

№ 10. Даты беларускага календара (снежань 2017 г.; студзень – люты 2018 г.; 14 дат).

№ 11. Даты сусветнага календара (юбіляры 2018 года).

№ 12. Дапаможныя паказальнікі да раздзела «Навінкі беларускага друку».

---

** Падпіска на часопіс праводзіцца па каталогу Белпошты «Газеты и журналы Республики Беларусь». Індэксы выдання – 74972 (інд.), 749722 (вед.).

## 7. **Універсальная дзесятковая класіфікацыя. Звыш 10 000 асноўных і дапаможных класаў**

*Адказны за выпуск Пугачова С.А.*




Пераклад класаў міжнароднай класіфікацыйнай сістэмы «Універсальная дзесятковая класіфікацыя» (УДК; англійская назва Universal Decimal Classification (UDC)) на сучасную беларускую мову зроблены на падставе англамоўнай эталоннай скарочанай версіі УДК (UDC Abridged Edition) міжнароднага Кансорцыума УДК (UDC Consortium).

Першае скарочанае выданне УДК на беларускай мове змяшчае больш за 10 000 асноўных класаў, дапаможныя табліцы і алфавітна-прадметны паказальнік.

Выданне будзе запатрабавана ў бібліятэках, кнігагандлёвых арганізацыях, інфармацыйных цэнтрах для сістэматызацыі дакументаў, арганізацыі дакументных фондаў і пошуку інфармацыі. Яно можа таксама выкарыстоўвацца ў метадычнай і вучэбнай рабоце пры правядзенні семінараў, майстар-класаў, трэнінгаў, чытанні адпаведных лекцыйных курсаў у сістэме падрыхтоўкі кадраў і павышэння кваліфікацыі для вышэй названых установ

## 8. **Францыск Скарына і сучаснасць:** зборнік п'ес

*Адказны за выпуск Суша А.А.*




У зборнік уключаны п'есы – пераможцы конкурсу «Францыск Скарына і сучаснасць». У драматычных творах прадстаўлены ўнутраны свет чалавека ва ўсіх яго складанасцях і ўзаемасувязях з гістарычным мінулым і сённяшнімі пераўтварэннямі жыцця. Зборнік будзе цікавы пісьменнікам, рэжысёрам, гісторыкам і ўсім аматарам тэатральнага мастацтва.

# Электронныя выданні

## 9. Социологические исследования в библиотеке: подготовка, организация, проведение

*Ответственный за выпуск Пшибытко М.Г.*

В издании описываются основные этапы проведения социологического исследования, начиная от его подготовки и заканчивая написанием научного отчета, даются рекомендации по выбору методов, приводятся примеры из опыта работы. Неоспоримую практическую ценность придают полные тексты отчетов о научно-исследовательских работах республиканского масштаба Национальной библиотеки Беларуси, опубликованные в издании.

# КАЛЯНДАРНЫ ПЛАН
## выхаду ў свет інфармацыйных выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 2017 г.

| № п/п | Выданне | Адказны за выпуск | Выхад у свет |
|---|---|---|---|
| | *ДРУКАВАНЫЯ* | | |
| 1 | Бібліятэчны веснік: зборнік артыкулаў. Вып. 9 | Пшыбытка М.Г. | Лістапад |
| 2 | Бібліятэчны свет: часопіс | Кірухіна Л.Г. | 1 раз у 2 месяцы |
| 3 | Вільня часоў Францыска Скарыны = Vilnius Pranciškaus Skorinos laikais = Vilnius in the time of Francysk Skaryna | Суша А.А. | Сакавік |
| 4 | Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 20 | Кірэева Г.У. | Чэрвень |
| 5 | Материалы V Международного конгресса «500 лет белорусского книгопечатания» | Есіс Н.С. | Верасень |
| 6 | Новыя кнігі: па старонках беларускага друку | Градоўкіна І.У. | Кожны месяц |
| 7 | Універсальная дзесятковая класіфікацыя. Звыш 10 000 асноўных і дапаможных класаў | Пугачова С.А. | Люты |
| 8 | Францыск Скарына і сучаснасць: зборнік п’ес | Суша А.А. | Люты |
| | *ЭЛЕКТРОННЫЯ* | | |
| 9 | Социологические исследования в библиотеке: подготовка, организация, проведение | Пшыбытка М.Г. | Снежань |

## ПРАПАНУЕМ НАБЫЦЬ

### ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ

Библиографическое описание книжных изданий: практическое пособие

Бібліятэчны веснік: зборнік артыкулаў. Вып. 1–8

Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 13–19

Інструментарый індэксатара і яго прымяненне ў бібліятэках Беларусі = Инструментарий индексатора и методика его применения в библиотеках Беларуси

Материалы Международных книговедческих чтений (IX–XII)

Материалы Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры» (I–IV)

Методические рекомендации по нормированию технологических процессов в библиотеке

Методические рекомендации по формированию библиографических записей на альбомы и атласы

Нацыянальная бібліяграфія Беларусі: методыка стварэння і выкарыстання электронных інфармацыйных рэсурсаў

Современные информационные технологии в библиотечно-информационном обслуживании пользователей с нарушениями зрения

Оформление библиографического списка к научной работе: методические рекомендации

### ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЫДАННІ

Агляд дзейнасці бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2011–2015)

«Верай і праўдай прайшоў праз эпоху...»: да 120-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы (1896–1991)

Паэт красы і гармоніі: да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча (1891–1917)

Подпольная и партизанская печать Беларуси. 3-е изд.

Служыць радзіме..: да 250 годдзя з дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага (1765–1833)

Спадчына Юзафа Ігнацыя Крашэўскага

100 год з гісторыі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі: дакументы і матэрыялы. 1840–1940 гг.

ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
ВЫПУСКУ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ВЫДАННЯЎ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ
на 2017 год

Падпісана да друку 30.12.2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Лічбавы друк.
Умоўн. друк. арк. 0,70. Ул.-выд. арк. 0,45.
Тыраж 90 экз. Заказ 729.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/398 ад 02.07.2014.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/157 ад 02.07.2014.

Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск.
Тэл. (+375 17) 293 27 68.
Факс (+375 17) 266 37 23.
E-mail: edit@nlb.by